найшырэй гэту тэму раскрывае песня, запісаная ў вёсцы Малыя Гарадзяцічы ад Марыі Слівец 1925 года нараджэння.

«Горкі палын, горкі палын // Горкі яго ўсё й карэньечко // Горкі яго ўсё й карэньечко // Да не люблю я свайго мужа // Страшнэ яго пакаленьечко // Страшнэ яго пакаленьечко // Да ён мяне б'е, карае, // Што я к яму дай не хілюся // Што я к яму дай не хілюся // Да прыхілюся я к бярэзцэ // Мне бярозка дай не мамачка // Вецер вее голье ломіць // Са мной бярозка дай не гаворыць // Прыхілюся я к дубочку // Мне дубочак дай не татачка // Вецер вее голье ломіць // Са мной дубочак дай не гаворыць // Прыхілюся я к вольхаццэ // А мне вольхачка дай не сястрыца // Вецер вее голье ломіць // Са мной вольхачка дай не гаворыць // Прыхілюся я к яварочку // Мне яварок дай не брацейка // Вецер вее голье ломіць // Са мной явар дай не гаворыць». У песні глыбінны сэнс, які перадае нават роднасныя пачуцці. Самы дарагі чалавек маці, а затым бацька, сястра , брат, а павінна жыць з мужам, хай сабе ён і «б'е , карае».

Такім ладам ішло жыццё на працягу многіх стагоддзяў, але прыйшла на Беларусь чырвоная навала і прынесла свае змены. Яны ж не маглі не адбіцца на песнях народа. Вось і з'явіліся новыя жніўныя песні. Фактычна яны былі відазмененыя аналагі старых: мяняўся тэкст, а мелодыя заставалася ранейшай: «Ай, добры дзень, калгаснае поле, // Жыта ядраное. Ай, добры дзень! // Ай, добры дзень, жнейкі маладыя. // Сярпы залатыя. Ай, добры дзень! // Прыхадзіце брыгадаю раненька, // Як узыдзе сонейка. Прыхадзіце! // Вы зажніце шырокае поле, // Жыта залатое. Вы зажніце!» (в.Калінаўка).

Не мог у новым часе не гучаць у песнях палітычны падтэкст, які павінен быў праслаўляць новы лад, а прыжываліся новыя песні, дзякуючы шчырай веры людзей у праўду новага ладу.

«А жнуць жнейкі, дажынаюць // І вяночкі завіваюць // Не для пана багатага // Для калгаса вялікіга». Магчыма, дзякуючы пераўвасабленням гістарычных пластоў традыцыйнай народнай культуры, яна і дажыла ў памяці носьбітаў да нашых дзён. Яе, як найвялікшую каштоўнасць, трэба зберагаць і перадаваць у спадчыну нашчадкам. Жніўныя песні − адзін з дыяментаў гэтай культуры і заслугоўваюць вялікай увагі і пашаны.

***Ларыса Рыжкова***

## «АБЫДЗЁННІК»: НАТАТКІ ПЕДАГОГА ПА БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ СПЕВАХ

Сучасныя людзі часцей жывуць у горадзе. Гавораць сцішана, рухаюцца не размашыста. Многія фізіічныя якасці чалавека знікаюць, як непатрэбныя яму. Сярод іх голас. Голасам чалавек можа спяваць, пасылаць інфармацыю, радавацца жыццю і яго працягу…

Народная практыка «пастаноўкі голаса» не была спецыяльным заняткам, а была часцінай хыцця. Разгледзім жыццёвыя сітуацыі «пастаноўкі голаса» для народных спеваў.

…У ДВАРЫ. Раней дом быў неабходны чалавеку, каб укрыцца ад непагоды, пераначаваць, а астатнія справы зручней было зрабіць, найперш, у двары. Тут быў хлеў, калодзеж, агарод, сад, майстэрні, баня, склепы, амбары і многае іншае. Тут чалавек быў гаспадаром і, не маючы суседа за сцяною- плотам, мог гаварыць громка, крычаць, клікаць. Гэты покліч мог быць накіраваны ў хату, на агарод, далёка ў поле, суседу ў другі двор, скаціне ў хлеў, курам, сабаке. Ужо з парога пачыналася пастаноўка голаса, фарміраваўся правільны пасыл гука і правільнае для таго дыханне.

…У ЛЕСЕ. У лесе спрадвечна людзі праводзілі многа часу за зборам грыбоў і ягад. У лесе маглі пасвіць мелкі статак (коз, авечак), рыхтавалі дровы, касілі траву на палянах. А каб не сумаваць, ці не згубіцца, ці не падпусціць блізка ваўка, мядзведзя, спявалі, перагукваліся.

Лес – добрая сітуацыя для пастаноўкі голаса. У лесе ўзнікае правільны пасыл гука і неабходная мера гука. У лесе ёсць пэўная акусціка. Гук пасылаецца, як праз рэшата з дрэў. Дрэвы нібы ўзносяць і разносяць гук. Лес дае адчуванне кучнасці спевакам, трымае іх на дасягальнай для ансамблевых спеваў адлегласці. Хто слаба чуе галасы, разумее, што далёка адышоў.

Спевы ў лесе прывучаюць слухаць - улічваць галасы другіх спевакоў. Строіць з імі музычную гармонію нават на адлегласці. Занятасць работай, нязручная поза, вызваляюць гук, дапамагаюць забыцца на яго, а, значыць, спяваць без зажымаў і фізічных напружанняў у голасе і дыханні.

…У ПОЛІ. У полі спявалі жнейкі, дзеці пад час гульняў, касцы і грабцы на касавіцы, талочнікі. У полі спяваць складана, таму што прастора наўкола і неба над галавой робяць чалавека кропелькай. А яшчэ бывае ветрана, неспакойна ў прыродзе. А яшчэ цяжкая праца жняі, калі выпадае спяваць, сагнуўшысь да зямлі.

Дапамагаў правільна знойдзены тон песні, максімальная рытмічная знітаванасць спеваў з працай, калі адно другому дапамагала, адно другое выклікала. Спевы, праца, дыханне, рухі калектыва жнеек былі знітаваны, як дзеянне аднаго гарманічнага арганізма.

Спевы ў полі дапамагалі знайсці адзінамагчымы спосаб пасылу гука, які пераадолее прастору і не змучае самаго спевака, не сарве голас, будзе і самаму спеваку ў асалоду.

…У ВЁСЦЫ. Многа жанраў у фальклоры існавала для спеваў на вясковай вуліцы. Гэта калядныя, вясельныя, вялікодныя, траецкія, зажынкавыя і дажынкавыя песні. Спявалі, ідучы па дарозе ці стоячы ў двары, пад вокнамі, на скрыжаванні дарог, у цэнтры вёскі. Такія спевы звязаны з рухам няспешным і з прытанцоўкай.

Гэта прамова, аб'ява, віншаванне, адрасаванае аднавяскоўцам, суседзям, гасцям. Такія спевы – аб'явы вучаць добра вымаўляць тэкст, непазбежна фарміруюць ідэальную артыкуляцыю, якой заўсёды здзіўлялі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фальклярыстаў вясковыя жыхары. На сваіх дыялектах яны гавораць хутка, дробна, выразна, як гарохам сыплюць. Такія спевы – прамовы, спевы- дразнілкі, кпіны, абразы бываюць багата інтанаваны.

…РУХ І ПРЫТАНЦОЎКА. Заўсёды спевы былі звязаны з рухам, працай, прытанцоўкай. Рухі рытмізавалі, фарміравалі, жанрава афарбоўвалі ўсе спевы, давалі ім пэўны пульс. Пры работе з сучаснымі спевакамі педагогу дапамагаюць спробы, спяваючы з ансамблем, капіраваць рухі жывёл, птушак, працоўныя працэсы. Такія пластычныя эцюды арганізуюць спевы і даюць выканаўцам і глядачам адчуванне жыццёвай праўды.

…СПЕВЫ Ў ЦАРКВЕ. Спевы на народным свяце выпрацоўваюць моцны гук, добры пасыл гука і правільнае, карыснае для спеваў дыханне. У царкве спеваку неабходны тыя ж якасці, але ў царкве імі нада акуратна карыстацца. У царкве галоўнае - думка, пачуццё, шчырая споведзь словамі малітвы, ці духоўнага верша. У голасе толькі цеплыня і спакой. У царкве нада трапляць у «залатое сячэнне гука» і нада строіць з галасамі іншых спевакоў. Не ідэальныя ансамблевыя спевы царкоўная акустыка ператворыць у кашу з галасоў. А спевы чыстыя царкоўная акустыка падкрэсліць і голас кожнага спевака данясе асобна. Будзе пачута кожная партыя і кожны голас.

Спевы ў царкве выпрацоўваюць мягкія, неагрэсіўныя, ідэальна чыстыя гукі і пачуццё гармоніі гукаў. Вопыт спеваў на вуліцы і ў руху спрацуе на якасць гука, якімі спявакі ў царкве ствараюць мастацкія вобразы і само мастацтва.

…КАЛЯ КАЛЫСКІ. Спевы для немаўлятак выхоўваюць мягкі, ласкавы, неагрэсіўны гук, які не пужае, не насцярожвае, а, наадварот, прыцягвае ўвагу, супакойвае, ахутвае дзіця, цікава яму. Так выхоўваюцца ў спевака якасці партнёрскія, кантактныя, а адчуваць партнёра (спевака, ці слухача), неабходна ў мастацтве ўвогуле, а ў спевах найперш.

Так ад нараджэння і на працягу жыцця голас быў з чалавекам, дапамагаў яму клікаць, збіраць, апавядаць, гукаць… і спяваць. Паспрабуем пералічыць якасці і адметнасці народнага спевака і народных спеваў, як часціны жыцця знікаючага вясковага гукарада.

АСАБІСТЫ ЎНІКАЛЬНЫ ТЭМБР КОЖНАГА ЧАЛАВЕКА. Голас у кожнага чалавека свой, непаўторны, як напаўторна і ўсё у чалавеку і ў прыродзе. Сучасны чалавек не заўсёды ведае сваю унікальнасць і сапраўднасць і не заўсёды ёю карыстаецца. Як птушка, як жывёла, як вада, як агонь, як вецер, так і чалавек мае сваю гукавую хвалю, па якой яго пазнаюць безпамылкова на гэтым свеце, а можа і ў сусвеце. Але свой голас нада раскрыць у сабе, нада раскрычаць яго, пачынаючы з калыскі. Нада карыстацца ім і ўсімі яго магчымасцямі.

ЛЁГКІ ГУК. У народных спевакоў здзіўляе лёгкасць і, адначасова, сіла гука. Так пяюць птушкі. Раскрываюць клювікі і ліюцца гукі на ўсё наваколле. Спевакі сучасныя, у другасных фальклорных калектывах, выконваючы «гуканне вясны» ці «жніво», залішне напружваюцца, чырванеюць, шумна дыхаюць. «Лёгкі гук» не значыць «ледзь жывы». Гэта значыць,што ён лёгка спеваком здабываецца і падаецца слухачам.

АДРАСНЫ ПАСЫЛ. Змест песні для аўтэнтычных выканаўцаў вельмі значны.. Любая песня- гэта пасланне, якое спевакі адрасуюць слухачу. І ў залежнасці ад месцазнаходжання слухача мяняецца і характар выканання. Калі "Вясну гукаюць", то гук пасылаюць за небакрай, дзе "Вясна спіць", купальскія песні пасылаюцца туды, куды ляцяць іскры ад купальскага вогнішча, ў неба над галавой. Масленічныя песні адрасуюцца вёсцы, ці плошчы. Вясёлая прыпеўка на свяце – хлопцу, дзеўцы, ці цешчы. Калыханка- дзіцяці ў калысцы. Песні жнеяк, што вяртаюцца з поля пасля жніва, адрасуюцца ў вёску, як паведамленне, што яны ідуць, што будуць "…каля печы варочацца, ды ў беленькай сарочачцы." Зразумелы сучаснаму чалавеку "адрасны пасыл" тэкста – гэта гуканне ў лесе, калі мы хочам дакрычацца да каго-небудзь, не заблудзіцца. "Адрасны пасыл"- гэта тэрмін тэатральнага рэжысёра і педагога К.С.Станіслаўскага з яго "Сістэмы выхавання акцёра".І пра "адрасны пасыл" добра ведаюць артысты драматычных і оперных тэатраў. Правільны пасыл – гэта і правільная думка, і выразная артыкуляцыя, і "па адрасе" адпраўленая энэргія выказвання.

НЕАБХОДНЫ ТОН. Тон, ці танальнасць – гэта найважнейшае ў спевах. У любым аутэнтычным ансамблі ёсць прызнаныя салісты, запявалы. І на гэтую ролю іх выдвігаюць самі ўдзельнікі ансамбля, таму што, калі песня добра запета, то лёгка будзе ўсім да голасу запявалы далучыцца, лёгка і радасна спяваць. А калі запявае не прызнаны самім народам аўтарытэт, а, напрыклад, культработнік з клуба, то, як кажуць самі ўдзельнікі ансамбля, "песняй можна падавіцца", "замучаешся, пакуль дапяеш" Вельмі важна, што салісту прызнанаму не нада"даваць тон", ён раскрывае рот, як тая птушка і трапляе адразу ў "залатое сячэнне гука". У ансамблі фальклорным такіх запявалаў- салістаў павінна быць хоць бы два. Для песен каляндарных часцей за ўсё нада запявала з высокім голасам, а для лірыкі звычайна нада нізкі запеў. І кожную песню народныя спевакі звычайна ведаюць "пад каго спяваць", хто лепей яе запяе. А паколькі кожны спявак пяе толькі "сваім голасам, сваім тэмбрам", у кожнага чалавека свая ўнікальная "гукавая хваля", то яму і думаць не трэба, нават шкодна "думаць, як заспяваць", нада проста заспяваць з поўным даверам да сябе, з прадчуваннем радасці, ад магчымасці перажыць салодкія моманты ансамблевага аднадушша ў прыгожым спеве. Сучасны ўрбанізаваны чалавек такога шчасця часцей за ўсё не ведае.

АНСАМБЛЬ. Ансамбль арганізуецца імгненна, калі ёсць спявак аўтарытэтны. Ён запявае песню, ён трымае яе тон, ён вызначае сілу пасыла гука, інтанацыю, акцэнты. Ён расказвае песню. Астатнія спевакі клапоцяцца пра якасць распева, пра ўсе упрыгожанні распева. Яны звычайна не становяцца лідэрамі песні,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

таму што яе не пачыналі. Саліст- гэта корань і ствол, а астатнія спевакі- гэта вецце, ліства, кветачкі і плады дрэва-песні.

Для ансамблевага спявання неабходны партнёрскія якасці, талент стать на момант спеваў адзінай сістэмай. Адзіным спеўныя арганізмам, інструментам. Адначасова гэта неабходныя ўмовы для ўзнікнення імправізацыі.

САПРАЎДНАСЦЬ ІНТАНАЦЫІ. Народным спевам вельмі ўласціва размоўная інтанацыя. Народная песня- гэта, найперш, аповед пра нейкія падзеі. Толькі расказваецца ён узнёсла, распеўна, карацей, прыгожа. Можа таму, што песні выконваліся не толькі для людзей жывых, але, найперш, і для тых, хто адышоў, а таксама для Бога, для святых. Размоўная, апавядальная логіка спеваў рытмізавала спевы, акцэнтавала, напаўняла энэргіяй пасылу.

УНУТРАНЫ МАНАЛОГ. Спяваючы народную песню, кожны спявак перажывае яе і расказвае слухачам. Ад гэтых прастадушных, шчырых аповедаў кожнага ўдзельніка песня, нават аднагалосная, становіцца фактурнай, шматгалосай. Яе расфарбоўваюць тэмбры і эмацыянальныя пасылы кожнага ансамблевага спевака. Пад час выканання песні кожны спявак думае пра сваё жыццё, пра падзеі яго і спавядаецца песняй, раскрывае сваю душу перад людзмі, родам і Богам.

СПЯВАК – АСОБА. Народнае мастацтва нарадзілася і жыло ў вёсцы, ці на хутары. І ідэальны для нас, фальклярыстаў, людзі, якія нарадзіліся і жывуць на зямлі, каля агародаў, каля рэчак, азёраў, палёў і лясоў. А яшчэ яны гаспадары сваіх хат, сваіх агародаў, ураджаяў, сваёй жывёлы. Сумесная праца, веданне ўсімі кожнага чалавека ад нараджэння, веданне ўсімі яго сям'і, яго продкаў, яго добрых і злых учынкаў, адкрытасць і відавочнасць усіх сфер жыцця, прыводзіла да адкрытасці і відавочнасці кожнага чалавека. Ніхто не мог зрабіць сабе лепшы імідж, лепшую "легенду" ці лепшае жыццё. Можна было толькі чысцей памыцца і акуратней апрануцца, болей працаваць і спадзявацца на Бога, што будзе лепшы ўраджай і багацейшы жаніх са сватамі завітае да дзеўкі, або багатая дзеўка пакахае гаротнага бедняка.

Адчуванні гаспадара і арганічная публічнасць адмянялі комплексы псіхалагічныя, а разнастайная фізічная праца, перамяшчэнні(поле, лес, рака, азяро…) вызваляла і ад фізічных зажымаў і комплексаў. Адкрытасць гадавала Асабоў, Характары, Індывідуальнасці. А для мастацтва гэта найважнейшыя якасці. Вясковыя людзі, як дзеці, жывыя і рэагуючыя. Калі аўтэнтычны ансамбль выходзіць на сцэну, то іх непасрэднасць, натуральнасць аказваецца для сучаснага чалавека часцяком важней і дзіўней за спевы. Мы ў горадзе губляем гэтую непасрэднасць і сваю Богам дадзеную ўнікальнасць.

СПЯВАК – ВУХА. Ідэальный ансамблевы спявак - гэта суцэльнае Вуха ў момант спявання. На аснове той гукавай карціны, якая далятае да Вуха, спеўны апарат, арганізм, душа (калі высокім слогам) спявака, выдаюць тую музыку, якае з'яўляецца ідэальнай для дадзенага моманту гучання. Спявак і сам не разумее, як гэта атрымліваецца, і адкуль у ім з'яўляюцца гэтыя гуказлучэнні. Фальклярысты не аднойчы назіралі ігру народных музыкантаў. У момант ігры у музыканта "няма твару на твары". Яго вочы, яго душа перасяляліся ў музыку, якая гучыць.

У сапраўднага ансамблевага спевака ў момант спеваў таксама вельмі задзейнічаны Вуха, якое слухае і Душа, якая выказваецца. Усё астатняе( розум, амбіцыі, характар) заміраюць, каб не нашкодзіць выніку-музыцы.

КАНТАКТ СА СЛУХАЧОМ. Аўтэнтычныя выканаўцы ўмеюць, спяваючы, кантактаваць паміж сабой, каб здзівіць слухача вельмі прыгожай, суладнай мелодыяй- музыкай. І кантактаваць шчыльна са слухачом, каб здзівіць сюжэтам – тэкстам песні. Яны "распавядаюць песню", вельмі любяць тэксты і не дазваляюць іх скарачаць. Для іх песня, як басня Крылова, мае сваю "мараль". Нават у песнях каляндарных заўсёды зафіксавана жыццёвая праўда, жыццёвыя адносіны дзяцей і бацькоў, сватоў, свякроваў, нявестак, кумоў, каханых…Тэксты народных песен – гэта энцыклапедыя жыццёвых сітуацый, надвор'яў, працы, войнаў, сенакосаў, жніва, Калядаў, Масляніц і інш. Прытым усё апісана народам вобразна і пераканаўча. Таму так даражаць словамі сваіх песен "апошнія з магікан" нашай вясковай рэальнасці і культуры.

*Дар'я Трубіна*

**КАЛЫХАНКА ЯК ФЕНОМЕН ФАРМІРАВАННЯ АСОБЫ**

Тэксты, мелодыіі, і абрадавыя дзеянні, якія передаваліся нам праз стагоддзі, пранізваюць эвалюцыю, гісторыю народа, вялодаюць вялікім сэнсам і нясуць у сабе глыбокія псіхалагічныя задумы. Міжвольна і даступна, падчас і незаўважна, фальклор на падсвядомым узроўні адчыняе і передае нам вялікі вопыт папярэдніх пакаленняў, іх чаканні, векавыя мары і ўзаемадзеянні мінулых, цяперашніх і будучых культур. І іх роля ў выхаванні вялізарная і, мабыць, ні з чым не параўнальная. Гэта міжвольнае выхаванне ахоплівае ўсе віды беларускага фальклору: казкі, песні, прымаўкі, загадкі і ў тым ліку калыханкі.

Жанр калыханкі неаднаразова разглядаўся даследнікамі. В.А.Жукоўскі ў 1889 годзе быў адным з першых, хто звярнуў ўвагу і паспрабаваў апісаць жанр калыханкі. Разгледзеўшы сабраныя і перакладзеныя ім калыханкі Персіі, апісаў укладзенае ў іх пачуццё клопату і пяшчоты маладой персіянкі аб сваім немаўляці [3]. З таго часу жанр калыханкі не заставаўся без увагі сярод навукоўцаў-фальклярыстаў, і зараз з'яўляецца важным сродкам педагагічнага ўздзеяння і псіхатэрапеўтычным эфектам.